# Міжнародная навуковая канферэнцыя «Восьмыя доўнараўскія чытанні»

## Міжнародная навуковая канферэнцыя «Восьмыя доўнараўскія чытанні» [1]

Чт, 26/10/2017 - 16:33 | Administrator



**21 – 22 верасня 2017 г. ў г. Рэчыцы Гомельскай вобласці адбылася навуковая**

**канферэнцыя «Восьмыя міжнародныя Доўнараўскія чытанні».**
Правядзенне навуковых чытанняў у гонар слыннага вучонага, аднаго з заснавальнікаў

беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі М. В. Доўнар-Запольскага на яго радзіме ў г. Рэчыцы

стала добрай традыцыяй. Сёлетнія чытанні, арганізаваныя Рэчыцкім раённым выканаўчым

камітэтам, Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф.

Скарыны, мелі асаблівы характар. Як адзначыла адказны сакратар аргкамітэту канферэнцыі

В. М. Лебедзева, дадзеная навуковая падзея, па-першае, была прымеркавана да 150-годдзя з дня нараджэння славутага навукоўца, па-другое, яна адметная вялікай ўвагай да самой персоны, да спадчыны Мітрафана Віктаравіча, пра што сведчыць удзел у чытаннях больш чым 60 даследчыкаў з Беларусі, Расіі і Украіны, у тым ліку 12 дактароў і 48 кандыдатаў навук.

На пленарным пасяджэнні былі заслуханы тры даклады: «”Акадэмічныя справы” М. В. Доўнар-Запольскага 1926 і 1930 гг.» (А. Л. Кіштымаў, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі), «Беларускія землякі М. В. Доўнар-Запольскага ў сценах Кіеўскага камерцыйнага інстытуту» (А. І. Чуткі, Нацыянальны авяцыйны універсітэт, г.

Кіеў) і «Археалагічны комплекс Капань 9: паселішча неаліту і могільнік сярэднедняпроўскай

культуры» (М. М. Крывальцэвіч, Інстытут гісторыі НАН Беларусі).

Затым праца канферэнцыі працягвалася ў секцыях.

На першай секцыі «М. В. Доўнар-Запольскі: жыццё, навуковая спадчына і даследчыцкія

традыцыі» аналізаваліся навуковыя погляды вучонага ў кантэксце развіцця расійскай і

беларускай гістарыяграфіі яго часу, разглядалася педагагічная і грамадска-палітычная дзейнасць славутага гісторыка. Сярод іншых з дакладамі на секцыі выступілі вядучыя навуковыя супрацоўнікі БелНДІДАС, кандыдаты гістарычных навук М. Ф. Шумейка і С. С. Рудовіч.

Другая секцыя «Фальклёрна-этнаграфічная спадчына і традыцыя М. В. Доўнар-Запольскага» разглядала ўклад даследчыка ў станаўленне беларускай этналогіі і фалькларыстыкі, абмяркоўвала актуальныя праблемы вывучэння традыцыйнай культуры жыхароў Рэчыцкага Палесся.

На трэцяй секцыі «Рэчыцкі рэгіён у часе і прасторы» быў абмеркаваны шырокі спектр пытанняў сацыяльна-эканамічнай, грамадска-палітычнай, ваеннай, духоўна-культурнай гісторыі Рэчыцкага краю ад Сярэднявечча да нашых дзён.

Удзельнікі канферэнцыі ўшанавалі памяць М. В. Доўнар-Запольскага ўскладаннем кветак да

яго помніка.

У рамках Доўнараўскіх чытанняў адбылася прэзентацыя кнігі «Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі. Выбранае», якая выйшла ў серыі «Беларускі кнігазбор» у выдавецтве «Беларуская навука». Гэтае ўнікальнае выданне, укладальнікам якога з’яўляецца В. М.

Лебедзева, налічвае амаль што 700 старонак. Акрамя таго, Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі арганізавала для ўдзельнікаў канферэнцыі выставу, на якой былі прадстаўлены прыжыццёвыя выданні твораў Доўнар-Запольскага, кнігі з яго бібліятэкі з дароўнымі подпісамі славутаму вучонаму.

Па выніках Восьмых Доўнараўскіх чытанняў мяркуецца выпусціць зборнік дакладаў іх удзельнікаў.

Раздел: Новости института [2]

**Источник:**
http://belniidad.by/content/m%D1%96zhnarodnaya-navukovaya-kanferentsyya-%C2%ABvosmyya-dounarausk%D1%96ya-chytann%D1%96%C2%BB

**Ссылки:**
[1] http://belniidad.by/content/m%D1%96zhnarodnaya-navukovaya-kanferentsyya-%C2%ABvosmyya-dounarausk%D1%96ya-chytann%D1%96%C2%BB
[2] http://belniidad.by/category/novosti-instituta/novosti-instituta